Падтрымай "Вясну" на PATREON

Вольгу Чайчыц і Сяргея Краўчука аштрафавалі на 30 базавых велічыняў

01.06.2015 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода слова
Крыніца: Прэс-служба БАЖ



Вольга Чайчыц. Фота: БАЖ, Б. Гарэцкі

Суд Дзяржынскага раёна (суддзя Шайко) прыняў рашэнне аштрафаваць журналістку Вольгу Чайчыц за парушэнне арт. 22.9 ч.2 КаАП на 30 базавых велічыняў - 5 млн 400 тыс. рублёў. Сяргея Краўчука таксама аштрафавалі на 30 базавых велічыняў.

На суд у Дзяржынск прыехалі каля 20 журналістаў, у тым ліку старшыня ГА "БАЖ" **Андрэй Бастунец**, намеснік старшыні **Міхась Янчук** і прэс-сакратар арганізацыі **Барыс Гарэцкі**.

Усіх ахвотных упусцілі ў памяшканне, але суддзя Шайко забараніла весці ў зале суда фота- і відэаздымкі і адхіліла хадайніцтва Вольгі Чайчыц пра вядзенне працэсу па-беларуску.

Абодвух абвінавачваюць у парушэнні арт. 22.9 КаАП (“незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі СМІ”). Падставай для складання пратаколаў стаў сюжэт з Фаніпалю (Дзяржынскі раён Мінскай вобл.) пра нядопуск здымачнай групы на грамадскае абмеркаванне генеральнага плану забудовы горада. Фаніпальская міліцыя раздрукавала тэкст і выявы сюжэта з сайта “Белсат” і звінаваціла журналістаў у працы без акрэдытацыі на замежны СМІ.

Вольга Чайчыц заявіла ў судзе, што толькі збірала інфармацыю, але не размяшчала яе на сайце "Белсата", бо не з'яўляецца супрацоўніцай ні гэтага, ні якога-кольвек іншага СМІ. Таму абвінавачваць яе ў “вырабе і распаўсюдзе прадукцыі СМІ” недарэчна. Адзін з фігурантаў згаданага сюжэту**Уладзімір Высоцкі** расказаў у судзе, што ў дзень правядзення здымкаў размаўляў са многімі журналістамі і не памятае, ці паказвала яму Вольга Чайчыц якія-кольвек дакументы. Адвакатка Чайчыц **Кацярына Пятровіч** настойвала на невінаватасці падабароннай з-за адсутнасці доказаў таго, што яна працуе як журналіст замежнага СМІ без акрэдытацыі.

Па падліках ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», у 2015 годзе беларускіх калег ужо 16 разоў прызнавалі вінаватымі ў парушэнні артыкула 22.9 КаАП, а агульная сума штрафаў па гэтым артыкуле цяпер перавышае 70 мільёнаў рублёў.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску


#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ
Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды апубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла аніжнальную атаку". Павел

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ

‹ ›



Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА